# АНІМАЦЫЯ

**Летні трыюмф Shrek II ва ўсім сьвеце сьведчыць пра незваротнае: анімацыя - мастацтва складаць з тысячы малюнкаў жывую карцінку - перажывае новы Рэнэсанс.**

У той час, калі 27 ліпеня менскія заўзятары мульцікаў хаваліся ў цемры залі к/т "Перамога" ад раптоўна выпаўшай месячнай нормы ападкаў і глядзелі маляваны фільм расейскага аніматара Аляксандра Пятрова "Стары і мора" (у 2000-м анімацыя атрымала "Оскар"), кампанія Lucasfilm Ltd., якая належыць стваральніку Star Wars Джорджу Лукасу, рыхтавала прэс-рэліз.

Тыднем пазьней Lucasfilm вуснамі сваёй прадстаўніцы Мішэліны Чаў афіцыйна абвесьціў пра стварэньне новага дэпартамэнту кампаніі. Посьпехі ShrekII (кампанія DreamWorks) і Finding Nemo (студыя Pixar) прымусілі задумацца Лукаса пра пашырэньне свайго шоў-бізнэсу. У якасьці нагрузкі да ўжо засвоенай вытворчасьці фільмаў, тэлеперадачаў і кампутарных гульняў зараз вядзецца актыўная праца над двума новымі напрамкамі (яны ж - пэрспэктыўна адзін): традыцыйны заходні мультыплікацыйны стыль і японскае анімэ. Спн. Чаў празрыста намякнула, што спалучэньне гэтых дзьвюх традыцыяў дапаможа зрабіць Lucasfilm канкурэнтам Дыснэю і мульты-Сьпілбэргу. Адпаведна, можна зрабіць выснову, што фактычна Лукасам будзе прадпрынятая спроба вынайсьці новы стыль у анімацыі.




Ведаючы, чым звычайна сканчваюцца пражэкты бацькі Star Wars, можна быць упэўненымі, што яго анімацыі ў пэрспэктыве ўвойдуць у другое, пашыранае выданьне кнігі "Animation Now!". Пакуль жа выдавецтва Taschen анансуе, што ў кастрычніку 2004 у крамы паступіць першае энцыкляпэдычнае выданьне "Animation Now!": "ад Біла Плаймптана да студыі Pixar: лепшая анімацыя ад пачатку да нашых дзён". Як звычайна, новая кніга Taschen уяўляе сабой найпадрабязьнейшую энцыкляпэдыю пра 80 лепшых у сьвеце спэцыялістаў па анімацыі - як асобных мастакоў, так і цэлых студыяў: "Ад А да Z, разам з прыкладамі іх работ, біяграфіяй, фільмаграфіяй, бібліяграфіяй, сьпісам узнагародаў і кантактнай інфармацыяй".

* * *

Вокладка кнігі "Animation Now!" (у дадатку - DVD)
Выхад: кастрычнік 2004
Кошт: USD 39.99/GBP 19.99/EUR 29.99/JPY 5900.00
Аўтары-складальнікі "Animation Now!": Aida Queiroz, Cesar Coelho, Loa Zagury і Marcos Magalhres. Яны займаюцца Anima Mundi, бразыльскім анімацыйным фэстам, які зьбірае штогод каля 80 000 наведнікаў; рэдактар - Julius Wiedemann, вядомы па працы над шэдэўрамі TASCHEN "Digital Beauties", "1000 Game Heroes" і TASCHEN's "1000 Favorite Websites".

# МІНАДУК

Матэрыял пра наступствы падаўжэньня тэрміну разьмеркаваньня (альбо тупеньне ў Еб*нях, альбо пераход на платнае, альбо "гуд бай, Ленін" за мяжу), які быў надрукаваны ў мінулым CD, атрымлівае свой працяг.

Паводле нашай інфармацыі, Мінадук не адмаўляецца ад падкінутай АГЛ ідэі працягнуць тэрмін разьмеркаваньня да пяці год, і новы Парлямэнт, хутчэй за ўсё, зацьвердзіць такія зьмены заканадаўча. Тым часам тыя ж крыніцы настойваюць, што сёлета доля першакурсьнікаў-платнікаў і бясплатнікаў у дзяржаўных ВНУ склала адпаведна 40/60. Статыстыка пацьвярджае тэндэнцыю: усеагульная бясплатная адукацыя зьнікне з далягляду гэтак жа хутка, як і ЭГУ зь іншымі прыватнымі ўнівэрамі (застануцца 1-2 для праформы). І такія цеслярухі не выпадковыя, бо дзяржава вырашыла, па-першае, зарабіць на асабліва разумных, а па-другое, з тых не асабліва разумных, якія пойдуць па разьмеркаваньні (уважліва прагледзьце сьпісы тых, хто паступіў, асабліва па накіраваньні), стварыць касту такіх рабоў майкрасофту, якія ў сваю чаргу будуць выхоўваць наступнікаў касты і г.д. Прычым абавязковым PR-бэкграўндам будзе ісьці: паўсюль у сьвеце плацяць, а мы што, лысыя?

Наконт выездаў на вучобу за мяжу таксама ня мусіць быць ніякіх ілюзіяў. У СМІ неаднойчы курсавала інфармацыя, паводле якой беларускую народную традыцыю летняга work & travel хоча ўзяць пад бух-улік БРСМ.

Так што галасуйце асьцярожна і не забудзьцеся паставіць пячатку, што пацьвярджае шматразовы выезд за мяжу.

* * *

*З інтэрвію рэктара БДУ Васіля Стражава газэце "Советская Белоруссия":*

"Калі нехта думае, што разьмеркаваньне дасталося нам ад савецкай адукацыйнай сыстэмы і, адпаведна, зьяўляецца перажыткам, то глыбока памыляецца. У Францыі, напрыклад, тыя, хто паступае на вызначаныя пэдагагічныя і мэдыцынскія спэцыяльнасьці, падпісваюць кантракт, у адпаведнасьці зь якім абавязаныя адпрацаваць пяць год там, куды накіруюць. Так што нічога ганебнага ў дзяржаўным разьмеркаваньні ня бачу. Тым больш сёньня, калі ёсьць выбар: хочаш быць вольным ад усялякіх абавязкаў - вучыся за плату. Атрымаў адукацыю за бюджэтныя сродкі, г.зн. за нашыя з вамі грошы - калі ласка, адпрацуй. Пра канкрэтныя тэрміны можна спрачацца. На мой погляд, аптымальны - ад трох, як было ў савецкія часы, да пяці год".

ом, новай якая з да іх і лей адумныя іх, як апоўніцца ае аюзаць бат і колькасьцю уць нуую

псуе сам го "Войти..." - е. Мех золата за ва падвесіць за рыста Rembo, ай і іншая а-ля прыклад таго, як прыцягнуць да ускіх разборак **рынамсі, час ад**

В БЕЛАРУСЬ
...ликоновой долине

**ЭЛЯСПОРТ**

**...м адыходзяць і яго калекцыі.**
...альнасьці, сёлета на першых лістоў менскіх моднікаў былі (збольшага для фімэйл) і ...мболіка бразыліянаў - жоўты для мэйл).
**...на вуліцах каля Кастрычніцкай ...а сябе новы трэнд: кэжуал спорт ...кі пачаў зноў перабірацца ў ...акой высновы падштурхоўваюць ...і менскага цэнтру: малыя, якія ў ...для нашай брукаванкі колькасьці ...оць на роварах, лазяць на іх ва ўсе ...сялякім чынам дэманструюць, што ...мусіць быць максымальна ..., лёгкім і надзейным.**
...такія (у сэнсе, малыя на роварах), ...ў абноўленых Fejcach.



/RU - 10/04